# АЛЯКСАНДР УЛАСАЎ –
# ЭКАНАМІЧНЫ АГЛЯДАЛЬНІК ГАЗЕТЫ «НАША НІВА»

**Аляксандр Тумар**

**Уласаў Аляксандр Мікітавіч** – выдавец, публіцыст, мемуарыст, грамадскі дзеяч. Нарадзіўся 16 жніўня 1874 года ў г. Вілейка, памёр у папраўча-працоўным лагеры, як было сказана ў даведцы, ад «паралiча сэрца» 11 сакавіка 1941 года.

Хто б мог падумаць, што просты сын паштмайстра стане рэдактарам і, больш таго, публіцыстам, як сёння б сказалі – эканамічным аглядальнікам, самай інтэлігентнай і самай беларускай газеты «Наша Ніва». А шлях яго да гэтага ляжаў праз далучэнне ў студэнцкія гады да беларускага нацыянальна-культурнага руху, знаёмства з «Минским листком» і арганізацыю Беларускай рэвалюцыйнай грамады (1902), якая перарасла ў хуткім часе ў Беларускую сацыялістычную грамаду. У 1906 годзе Аляксандр Уласаў ужо са сфармуляванымі ідэаламі і мэтамі, сваім поглядам на жыццё, знаёміцца з Якубам Коласам. Гэта пасля дапаможа Уласаву-рэдактару прыцягнуць да працы ў газеце многіх пісьменнікаў. У тым жа годзе ён становіцца рэдактарам-выдаўцом «Нашай Нівы». Акрамя арганізатарскай працы, якую ён, трэба сказаць, праводзіць даволі ўдала, бярэцца за эканамічную праблематыку. Сфера, якая зацікавіла публіцыста і прадвырашыла ягоную будучую творчую манеру і стыль, становіцца пажыццёвай.

Афіцыйна лічыцца, што Аляксандр Уласаў за ўвесь час працы ў «Нашай Ніве» напісаў 25 артыкулаў, з якіх 17 – на эканамічную праблематыку. Звычайна падпісваўся альбо сапраўдным прозвішчам, альбо крыптаграмамі А.У., А.Ў., А.Ула-ў. Цікава, што пад эканамічнымі артыкуламі традыцыйна падпісваўся пачатковымі літарамі свайго імя і прозвішча. Некаторыя даследчыкі творчасці Уласава сцвярджаюць, што былі і непадпісаныя артыкулы, але аб гэтым ніжэй. Загалоўкі асаблівай разнастайнасцю не вызначаюцца. Невялікія па аб’ёму, але змястоўныя, яны актуалізуюць галоўную думку твора, такім чынам выконваючы сваю асноўную функцыю. «Што такое земства?» (6 чэрвеня, 1908 г.), «Абарот капіталаў у Беларусі» (17 чэрвеня, 1910 г.), «Дарагоўля харчовых прадуктаў і вываз іх за граніцу» (23 лютага, 1912 г.), «Эміграцыя і танны павер» (20 чэрвеня, 1913 г.), «Аб выездзе ў Амерыку» (17 кастрычніка, 1913 г.) і г.д.

У адным з самых першых артыкулаў у «Нашай Ніве» ён напісаў наступнае: «Усе, хто прывык шанаваць кожную нацыю і кожнага чалавека, ведаюць, што ў роднай мове сваёй беларус усё лепш разумее, што тая мова – гэта яго душа, сэрца, усё, што ёсць самае блізкае і дарагое чалавеку. І беларусам, беручы культуру ад рускіх і ад палякаў, няма ніякай патрэбы забываць, што яны беларусы, адракацца ад сваёй нацыі і перакідацца да чужой» (Наша Ніва, 1908, 25 красавіка). Уласаў застаўся верным тэзісу да апошняга дня жыцця. Кожны артыкул – напамін беларускай нацыі аб яе самазначнасці і незалежнасці. Лейтматывам праходзіць гэтая думка нават у артыкулах на эканамічную праблематыку. Няма песімістычных ідэй пра цёмную будучыню Беларусі, якую прадракалі многія ў тыя часы, няма несуцяшальных прагнозаў; ён выхоплівае з кожнага факта светлы прамень, аналізуе яго і дае надзею на лепшае жыцце. Але сказаць, што Уласаў бачыць усё праз ружовыя акуляры, было б няправільна. Аб’ектыўнасць – адна з неад’емных якасцей публіцыста, і ён добра разумее неабходнасць праўдзіва распавядаць пра эканамічнае жыццё Беларусі. Прафесіянальна аналізуючы кожную сітуацыю, ён прымушае чытача бачыць на свае вочы лічбы і працэнты, а галоўнае – разумець, што за імі стаіць. «У Цэнтральнай Расеі, у Прыбалційскім краі, у Польшчы, на Украйне і ў паўночных губерніях казна мае даходу на 726 мільёнаў рублёў больш, чым расходаў. Гэтым і пакрываецца недахват грошэй у нас і на іншых месцах. Выходзіць, што на тое, каб у нас стаяло войско, два упраўленьня жалезных дарог і т.п., другіе губерніі выплачваюць нам 38 мільёнаў рублёў. Гэтые грошы ўжо саўсім астаюцца ў нас, гэта – чысты заработак нашага краю» («Аб экономічным палажэньні нашага краю», 1 красавіка, 1910 г.).

Другая публіцыстычная рыса Уласава, характэрная яго творчасці, – гэта даступнасць. Вельмі важна ўбачыць і зразумець свайго чытача. Здаецца, першы беларускі эканамічны аглядальнік не толькі ўбачыў і зразумеў, але і знайшоў яго. Хаця многія развагі і тлумачэнні выглядаюць наіўнаватымі, гэта прыкмета добрага ўсведамлення характару аўдыторыі. Вось, напрыклад, як ён распавядае пра функцыянаванне банкаўскай сістэмы: «*Па другіх гасударствах людзі зразумелі, што грошы, як і тавар, для свайго звароту павінны мець такую асобную краму (банчок). У такім банчку грошы робяць акураны зварот; адзін туды кладзе, напрыклад, 100 рублёў, другі прыходзе і кажэ: «пазычце мне 100 рублёў». Банчок яму дае. Такі банчок запраўляецца выбарнымі*

*людзьмі, каторых выбіраюць хаўруснікі. Банчок плаціць тым, хто кладзе грошы, па 6–7 працэнтоў, а з тых, хто пазычае, бярэ 8–10 %. Часць чыстаго дахода дзеліцца памеж хаўруснікамі, а часць ідзе ў запасны капітал»* («Хаўрусныя банчкі», 28 студзеня, 1910 г.). Структура эканамічнага агляду па-ўласаўскі – фактычна структура эканамічнага артыкула сучаснага:

1. Уводзіны ў курс справы (5–7 сказаў).
2. Фармуліроўка праблемы.
3. Параўнанне сітуацыі з мінулым альбо з палажэннем у суседзяў.
4. Гіпатэтычная прычына ўзнікнення праблемы.
5. Шляхі вырашэння праблемы.

Трэба таксама адзначыць такую карысную якасць публіцыста, як уменне аперыраваць лічбамі. З іх дапамогай ён робіць матэрыял больш фактычным, доказным. Калі неабходна – робіць сістэматызаванне, зводзіць у табліцы.

Што тычыцца «ананімных» артыкулаў Аляксандра Уласава. Сапраўды, некаторыя эканамічныя агляды ў «Нашай Ніве» засталіся без подпісу. Але прыватна я магу прывесці некалькі доказаў таго, што большасць з іх належыць Уласаву. Узяць хаця б артыкул «Заграгічны гандаль Расеі і яе фабрычны промысел у першай палове 1910 года» (9 верасня, 1910 г.). Па-першае, ён знаходзіцца на другой-трэцяй старонцы – звычайнае месца ўласаўскіх матэрыялаў. Па-другое, супадае і структура і форма (насычанасць лічбаў, характэрны загаловак). Па-трэцяе, выкарыстоўваюцца адны і тыя ж спецыфічныя тэрміны («абарот», «промысел», «чысты заработак» і г.д.). Па-чацвёртае, ніхто, акрамя Уласава, эканамічнай праблематыкай у тыя часы не займаўся.

Можа, мае аргументы не гучаць так пераканаўча, як мне б хацелася, але нават і гэтыя семнаццаць артыкулаў – добры зачын Аляксандра Уласава беларускай эканамічнай публіцыстыкі.